# З ЛЮБОЎЮ ДА РОДНАГА СЛОВА

**СЛОНІМ. У горадзе над Шчарай да Сусветнага дня роднай мовы прымеркавалі пасяджэнне тэматычнай літаратурнай гасцёўні.**

У літаратурна-этнаграфічным музеі Дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 8 г. Слоніма» ў рамках Дэкады беларускай мовы і літаратуры было арганізавана мерапрыемства ў фармаце літаратурнай гасцёўні пад лірычнай назвай «Ты, роднае слова, мне люба і міла!». Падобныя мерапрыемствы сталі ўжо добрай традыцыяй у гэтай установе адукацыі. 24 лютага да школьнікаў завітала дэлегацыя Слонімскага раённага літаратурнага аб’яднання імя Анатоля Іверса ў складзе: члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэсы Ірына Войтка і Надзея Салейка, а таксама слонімскія паэты Тамара Пяцеліна, Мікалай Емельянчук і Наталля Новік.




Літаратары раённага цэнтра чыталі ўласныя вершы, дзяліліся кранальнымі ўспамінамі, знаёмілі аўдыторыю з цікавымі фактамі з жыцця літаратурнага аб’яднання і ўласнай творчай біяграфіі. Вучні мелі магчымасць акунуцца ў непаўторную атмасферу беларускага слова, бліжэй пазнаёміцца з творчасцю паэтаў-землякоў, адчуць прыгажосць і мілагучнасць нашай роднай мовы. Юныя землякі з неменьшай асалодай і непераўзыдзеным майстэрствам чыталі вершы гасцей, удзельнічалі ў квэст-гульні. Цудоўным і незвычайным падарункам для ўсіх сталі песні ў выкананні Надзеі Салейкі і вершы настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Ірыны Ганісеўскай *(на фота).*

І свята роднага слова сапраўды атрымалася. Увесь час тут панавала атмасфера цеплыні роднасных душ і шчырасці сяброўскіх пачуццяў. У якасці падарункаў школьнаму літаратурна-

этнаграфічнаму музею госці пакінулі зборнікі сваіх твораў, архіўныя фотаздымкі і сфатаграфаваліся з гаспадарамі на добры напамін.

## САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
### ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

**На здымках:** у літаратурнай гасцёўні пад назвай «Ты, роднае слова, мне люба і міла!» з удзелам дэлегацыі Слонімскага раённага літаратурнага аб’яднання імя Анатоля Іверса. Слонім, Гродзенская вобласць. Люты 2025 года.



Выступае паэтэса Тамара Пяцеліна



Выступае член СПБ, паэтэса Ірына Войтка (кіраўнік раённага літаб'яднання)



Член СПБ,
паэтэса, аўтар і
выканаўца
песень
Надзея Салейка




Выступае слонімская паэтэса Наталля Новік





Літаратурная квэст-гульня




Аўтарская кніга – у падарунак


Слонім